Іван ШАМЯКІН

# СЛОВА ПРА ДОБРАГА ЧАЛАВЕКА

*80 гадоў з дня нараджэння Ціхана Кісялёва*

Гісторыя — гэта людзі і іх учынкі. На вайне героем можа быць і радавы, і галоўнакамандуючы. Розніца ў тым, што радавы робіць фактам гісторыі адзін ці некалькі баявых подзвігаў. Галоўнакамандуючы робіць гісторыю вайны. Гэта ж датычыць і гісторыі мірнага часу.

Народ-пераможца пасля вайны тварыў яшчэ адзін подзвіг — працоўны. Але, як і на вайне, народ павінен мець сваіх камандзіраў і камандуючых. І яны з`явіліся, яны выйшлі з народа — кіраўнікі розных маштабаў: заводскага, калгаснага, раённага, абласнога, рэспубліканскага.

Мая вучоба ў партшколе, пасада сакратара і першага сакратара Саюза пісьменнікаў, абавязкі Старшыні Вярхоўнага Савета, якія я выконваў чатырнаццаць гадоў, давалі мне магчымасць блізка назіраць працу кіраўнікоў рэспубліканскага і Мінскага гарадскога рангаў. За рэдкім выключэннем, гэта былі людзі, якія працавалі шчыра і аддана, не думаючы пра асабістыя катэджы і "Волгі". Да іх трэба аднесці і Ціхана Кісялёва.

Навечна ў памяці народа застаўся правафланговы пасляваеннай кагорты кіраўнікоў Пятро Міронавіч Машэраў.

Немагчыма назваць усіх, хто служыў народу праўдай і верай. Але з пачуццём душэўнай цеплыні і ўдзячнасці я ўспамінаю Сяргея Прытыцкага, Ціхана Кісялёва, Івана Палякова, Аляксандра Аксёнава, Івана Клімава, Уладзіміра Мікуліча, Мікалая Дземянцея, Міхайлу Кавалёва, Ніну Сняжкову, Аляксандра Кузьміна, Яфрэма Сакалова, Аркадзя Рудака, Васіля Шарапава... З міністраў хочацца назваць Івана Жыжаля, Анатоля Андрэева, Баляслава Шацілу...

Няхай мне прабачаць іншыя, я назваў тых, хто дапамагаў мне вырашаць нялёгкія праблемы развіцця беларускай літаратуры, кнігавыдання, жыццяўладкавання маладых пісьменнікаў, іншых прадстаўнікоў інтэлігенцыі і проста радавых працаўнікоў, якія звярталіся да мяне са сваімі клопатамі, як да дэпутата, пісьменніка.

Людзей, якія валодаюць пачуццём гумару, я заўсёды лічыў разумнымі: тупак смешнае не прыдумае. І яны, гэтыя людзі, прыцягваюць, выклікаюць павышаную цікавасць у любой грамадзе, а для празаіка, драматурга — гэта знаходка. Не дарэмна я так горача любіў выдатнага гумарыста і сатырыка Андрэя Макаёнка. Прызнанымі гумарыстамі сярод тых, каго я назваў, былі Палякоў і Кісялёў.

Пад час сесіі Вярхоўнага Савета я, Старшыня, радаваўся кожнаму перапынку, каб папіць у пакоі адпачынку каву разам з імі, гэтымі адменнымі жартаўнікамі. Іншыя члены бюро вялі сур`ёзныя размовы, вырашалі пытанні, якія не выносіліся ў залу. Ціхан Якаўлевіч і Іван Яўцеевіч адводзілі 15—20-мінутныя адпачынкі на тое, каб пажартаваць. Ужо ў гэтым праяўлялася іх мудрасць: адпачынак — для пацехі.

Часцей за ўсё яны бяскрыўдна кпілі адзін з аднаго. Часам шпілялі кагось з калег. Рэдка чапалі Машэрава: першая асоба ў рэспубліцы не вельмі была здатнай да жартаў, хоць з чужых жартаў Пётр Міронавіч смяяўся шчыра і весела. Яшчэ раз магу толькі пашкадаваць, што, малады, я спадзяваўся на сваю памяць і не запісваў сур`ёзныя размовы, а тым больш жарты. Як многа выветрыла з галавы старасць!

Прыгадваю адну з пікіровак Ціхана Кісялёва і Івана Палякова, двух Старшынь — Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Саўміна.

— Ціхан, ты ж старавер. Ты ж з Агародні-Гомельскай, дзе адны маскалі.

— Не. Я не старавер. Я з Агародні-Кузьмініцкай. Спытай у Шамякіна. Ён табе растлумачыць, якая розніца паміж Агароднямі. А вось ты старавер Новабеліцкі.

— А я і не таю гэтага, як ты. — І да мяне: — Іван, сын Пятроў, пацвердзі, што я расказваў табе пра сваё стараверства. А цяпер скажы: Ціхан — маскаль?

— Не.

— Спеліся. Улашчыў ты пісьменніка. Чым толькі? Кватэркі падкінуў для паперамараццеляў?

— Навошта нам спявацца ці співацца? Мы з ім да адных дзяўчат хадзілі, і ён знае да якіх. Староверкі нас не прымалі.

Да дзяўчат мы з Ціханам Якаўлевічам не хадзілі. Па-першае, ён быў больш чым на тры гады старэйшы. А па-другое, бацька мой вывез мяне з Кармы, дзе я нарадзіўся, у далёкае лясніцтва, калі мне ішоў пяты год. Але па месцы нараджэння мы з Кісялёвым блізкія суседзі. Ад маёй Кармы да мястэчка Агароднея-Гомельская няпоўныя тры вярсты. На Беларусі мястэчкі былі пераважна яўрэйскімі. У Агародні, як і ў Ветцы, Свяцілавічах, аселі стараверы, якія ў XVII стагоддзі ратаваліся ў Вялікім княстве Літоўскім ад Ніканаўскай рэформы. У нас, на Гомельшчыне, як і на Украіне, іх называлі маскалямі. Гандлем яны займаліся не горш за яўрэяў, але пасяленні іх былі закрытымі "рэзарвацыямі". Шлюбы паміж старажверамі і "ніканаўцамі" былі вельмі рэдкія.

Цяпер на картах пазначана адно вялікае сяло — Агароднея-Гомельская. Але значна раней там існавала і Агароднея-Кузьмініцкая. Ручай раздзяляў два гэтыя пасяленні: хата каля хаты, вокны ў вокны жылі перасяленцы-стараверы і карэнныя беларусы, якіх маскалі называлі кацапамі.

Ціхан Кісялёў — з Агародні-Кузьмініцкай. У маладыя гады, калі я цікавіўся сваёй радаслоўнай і радаслоўнай вядомых землякоў, я знаходзіў у Карме нямала сваякоў Якава Кісялёва, а значыцца і Ціхана. Некаторыя з іх былі нават у сваяцкіх адносінах з маімі траюраднымі сёстрамі і братамі па матчыным родзе, настолькі разгалінаваным, што я не ведаў і дзесятай часткі гэтых "сваякоў". У сталыя гады ў Карме я не жыў, толькі зрэдку прыязджаў. І яны мяне не турбавалі просьбамі.

Раней, чым з Ціханам Якаўлевічам, я пазнаёміўся з яго жонкай Нінай Фёдараўнай. Пасля партыйнай школы мяне накіравалі працаваць загадчыкам рэдакцыі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы